**УДК 351.853.3(476.5)+904:726.82(476.5)«17/19» DOI 10.52928/2070-1608-2023-66-1-14-20**

# АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ НА МОГІЛЬНІКУ КАЛЯ ВЁСКІ ВАСЬКАВІЧЫ ГЛЫБОЦКАГА РАЁНА[1]

***канд. гіст. навук, дац. В.У. ЧАРАЎКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0001-9594-0430***
***e-mail: viktar.charauko@gmail.com***

*Артыкул прысвечаны апісанню археалагічных даследаванняў на грунтовым могільніку каля былой вёскі Васькавічы Глыбоцкага раёна. На могільніку меліся каменная канструкцыя ў выглядзе абкладкі і два каменных крыжа. Было даследавана два мужчынскіх пахаванні. Касцякі арыенціраваны галавой на захад з адхіленнямі да поўначы. У запаўненні магільных ям знаходзіліся рэшткі трун з дошак, змацаваных цвікамі. Пахавальны інвентар прысутнічаў у абодвух пахаваннях і прадстаўлен гузікамі, нацельным крыжыкам і медальёнам. Памінальны інвентар прадстаўлены фрагментамі керамічнага посуду. Інвентар дазваляе датаваць пахаванні XIX – пачаткам XX ст.*

***Ключавыя словы:*** *пахаванні, могільнік, Беларускае Падзвінне, Васькавічы, каменныя надмагіллі, каменныя крыжы.*

**Уводзіны.** Перспектыўным напрамкам археалагічных даследаванняў з’яўляецца вывучэнне пахавальных помнікаў насельніцтва Беларусі позняга Сярэднявечча – ранняга Новага часу (XIV – XVIII стст.). Сельскія пахавальныя помнікі гэтага перыяду ў асноўным прадстаўлены грунтовымі могільнікамі і пахаваннямі на пляцоўках курганных груп больш ранняга перыяду. На Беларускім Падзвінні пераважная большасць пахаванняў мае разнастайныя каменныя надмагіллі. Яны могуць уяўляць сабой валуны ў галавах і/або нагах пахавання, суцэльныя каменныя выкладкі, абкладкі магільных насыпаў па перыметры, каменныя крыжы. Гэта дазваляе лічыць каменныя надмагіллі характэрнымі маркёрамі пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV – XVIII стст. [1, с. 126, 136]. З улікам таго, што познесярэднявечныя пахаванні ў асноўным безынвентарныя, археалагічныя даследаванні на новых і ўжо выяўленых некропалях дазваляюць удакладніць датаванне помнікаў і нашы ўяўленні аб пахавальным абрадзе.

**Асноўная частка. Размяшчэнне могільніка Васькавічы.** У 2010 г. на тэрыторыі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці намі праводзіліся археалагічныя раскопкі і разведкі познесярэдневяковых пахавальных помнікаў[2]. Адным з абследаваных аб’ектаў сталі могілкі каля былой вёскі Ва́ськавічы[3]. Аб наяўнасці там магіл з каменнымі крыжамі паведамляў у сваёй «Археалагічнай карце» Г.В. Штыхаў [2, с. 43]. На момант разведак вёска перапыніла існаванне, а закінутыя могілкі густа зараслі хмызняком і лесам. Пляцоўка могільніка знаходзіцца ў 25 м на поўдзень ад трасы, што злучае в. Зябкі з г. Ушачы (малюнак 1). Недалёка размешчаны познесярэдневяковыя могільнікі каля вёсак Доўгае і Івесь. Адлегласць ад іх да могільніка Васькавічы складае, адпаведна, каля 1 км і 8 км па прамой. Пры візуальнай разведцы на могільніку быў выяўлены каменны крыж (каменны крыж 1, малюнак 1).

У 2015 г. намі праводзіліся раскопкі на познесярэдневяковых могільніках Доўгае і Івесь Глыбоцкага раёна, пахаванні на якіх абазначаны каменнымі надмагіллямі і крыжамі. Паўторная візуальная разведка і шурфоўка была праведзена і на могільніку каля былой в. Васькавічы[4]. Мэтай шурфоўкі было ўдакладненне храналогіі помніка і вызначэнне асаблівасцей пахавальнага абраду.

**Апісанне шурфа.** Пляцоўка каля каменнага крыжа 1 была ачышчана ад хмызняку. На захад ад крыжа 1 выяўлена каменная абкладка. На пляцоўцы быў закладзены шурф памерамі 3 × 3 м. Ён быў арыентаваны па баках свету (малюнкі 1–2) і закладаўся з разлікам, каб уключыць крыж 1 і каменную абкладку. Памеры шурфа тлумачацца імкненнем даследаваць выяўленую каменную канструкцыю пры невялікай колькасці наяўных людзей і абмежаваным часе. У працэсе шурфоўкі выявілася, што касцякі пахаванняў выходзяць за межы шурфа, таму з усходняга боку да яго была зроблена прырэзка плошчай 1 м$^2$. У выніку агульная плошча шурфа склала 10 м$^2$.

Пляцоўка мела рэзкі нахіл з поўдня на поўнач, перапад вышынь у межах шурфа складаў каля 0,5 м. Каменны крыж 1 размяшчаўся ў квадраце Б1. На захад ад крыжа 1 у квадратах Б1 і Б2 знаходзілася пазначаная

---

[1] Артыкул падрыхтаваны ў межах Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» на 2021–2025 гг. (падпраграма «Гісторыя», заданне «Археалагічная спадчына як фактар забеспячэння гуманітарнай бяспекі беларускага грамадства», праект «Гаспадарка, культурныя традыцыі і насельніцтва Полацка і Полацкага Падзвіння ў эпоху станаўлення і развіцця гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці ў IX–XVIII стст.», дзяржаўная рэгістрацыя № 20211489 ад 21.05.2021).

[2] Чараўко В.У. Справаздача аб археалагічных разведках на тэрыторыі Глыбоцкага і Ушацкага раёнаў Віцебскай вобласці ў 2010 годзе / Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага навуковага архіва (ФАНД ЦНА) НАН Беларусі. – Спр. № 2878.

[3] Аўтар выказвае падзяку старшаму выкладчыку кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай А.Л. Коцу і В.А. Коц за дапамогу ў арганізацыі даследаванняў каля в. Васькавічы.

[4] Чараўко В.У. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на могільніках каля вёсак Доўгае, Васькавічы, Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці ў 2015 годзе / ФАНД ЦНА НАН Беларусі. – Спр. № 3350.

канструкцыя ў выглядзе абкладкі, арыенціраванай па лініі поўнач – поўдзень. Яна складалася з пятнаццаці камянёў. Яшчэ адзін камень знаходзіўся на ўсход ад крыжа (малюнак 2).




**Малюнак 1. – Могільнік каля в. Васькавічы Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Сітуацыйны план**




**Малюнак 2. – Могільнік каля в. Васькавічы Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Шурф 2015 г.**
**Каменныя канструкцыі на ўзроўні дзённай паверхні**

Вышыня наземнай часткі крыжа 1 складала 0,63 м, шырыня перакладзіны 0,65 м. У ходзе шурфоўкі крыж быў вынуты з зямлі. Яго агульная вышыня склала 1,07 м. Крыж 2 знаходзіцца на адлегласці каля 10 м на паўднёвы ўсход ад крыжа 1 (гл. малюнак 1). Вышыня яго наземнай часткі 0,53 м, шырыня перакладзіны 0,73 м.

Пасля зняцця слоя дзёрану ў працэсе разбора пласта 1 (0,2 м ад узроўню дзённай паверхні) быў выяўлены працяг каменных канструкцый (малюнак 3). З паўднёвага боку крыж утрымліваўся на трох невялікіх камянях, пакладзеных каля яго падножжа. З паўночнага і паўночна-ўсходняга бакоў каля падножжа крыжа знаходзілася яшчэ два камяні. Адзінаццаць камянёў размяшчаліся ў квадраце А1 на ўсход ад каменнага крыжа 1, яшчэ 5 ляжалі на поўнач ад крыжа ў квадраце Б2, 1 камень знаходзіўся ў паўднёва-заходнім куце шурфа ў квадраце Б1.

У пласце 2 (0,4 м ад узроўню дзённай паверхні) было зафіксавана 4 камяні, што знаходзіліся ў квадраце А1 (малюнак 4). На мяжы квадратаў Б1 і Б2 выяўлена лінза пяску, перамяшанага з залой і вуголлем, што ўказвае на развядзенне вогнішча. Пад лінзай знаходзілася скапленне дробных каменьчыкаў памерамі 1–2 см. У межах пласта 2 у квадратах Б1, Б2 і А2 адбыўся выхад на мацярык.




**Малюнак 3. – Могільнік каля в. Васькавічы Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Шурф 2015 г. Каменныя канструкцыі пласта 1 (0,2 м ад узроўня дзённай паверхні)**




**Малюнак 4. – Могільнік каля в. Васькавічы Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Шурф 2015 г. Каменныя канструкцыі пласта 2 (0,4 м ад узроўня дзённай паверхні)**

У паўднёва-ўсходняй частцы шурфа (квадраты А1 і А2) былі выяўлены 2 пахаванні, касцякі якіх выходзілі за межы шурфа (малюнак 5). У сувязі з гэтым было прынята рашэнне зрабіць прырэзку з усходняга боку. Памер прырэзкі быў абмежаваны паваленым дрэвам на ўсход ад шурфа.

Параўнанне планаў размяшчэння пахаванняў і камянёў паказвае, што каменная канструкцыя ў квадратах Б1 і Б2 на ўзроўні дзённай паверхні, выцягнутая з усходу на захад, з'яўляецца не надмагіллем, а абкладкай сцежкі-ўваходу на могілкі. Каменных канструкцый, якія б адносіліся да пахавання 2, не зафіксавана. Пахаванне 1 на

ўзроўні дзённай паверхні было пазначана вялікім камянём у галавах. Гэты камень і камяні ў пластах 1–2 квадрата А1 складаюць канструкцыю ў форме суцэльнай вымасткі, што размешчана практычна над касцяком пахавання 1 (над верхняй паловай шкілета) з невялікім адхіленнем. Разам з тым, на адлегласці каля 0,8 м на поўдзень ад пахавання 1 размешчана пахаванне 3 (не даследавана, выходзіць за межы шурфа). Магчыма, частка камянёў у квадраце А1 адносілася да надмагілля пахавання 2. Каменны крыж 1 знаходзіцца дастаткова далёка як ад пахавання 1, так і ад пахавання 3 (на адлегласці 0,5 м). Ён мог адносіцца як да надмагілля пахавання 1, так і да надмагілля пахавання 3 і змясціцца з часам з прычыны перападу рэльефа. З прычыны блізкага размяшчэння пахаванняў 1 і 3 дакладнае размежаванне камянёў у квадраце А1 паміж надмагільнымі канструкцыямі пахаванняў 1 і 3 праблематычна.




**Малюнак 5. – Могільнік каля в. Васькавічы Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Шурф 2015 г. План пахаванняў**

**Стратыграфія шурфа** мела наступны выгляд. Пад слоем дзёрану знаходзілася праслойка цёмнай, насычанай арганікай глебы магутнасцю каля 0,1 м. Пад ёй ішоў слой жоўтага пяску, у які былі ўпушчаны пахаванні. У выніку ажыццяўлення пахаванняў на ўсходнім, паўднёвым і заходнім прафілях чытаюцца ямы ад перакопаў. На паўднёвым профілі прысутнічае лінза з светла-шэрага пяску. Пад жоўтым пяском знаходзіўся светлы, бледна-жоўты пясок.

Пасля завяршэння работ шурф быў засыпаны, дзённая паверхня рэкультывавана.

**Апісанне пахаванняў.** У квадратах А1 і А2 было выяўлена тры пахаванні. Даследавана два з іх.

*Пахаванне 1* знаходзілася на глыбіні 1,21 м ад узроўню дзённай паверхні (гл. малюнак 5). Касцяк арыенціраваны галавой на захад з адхіленнем да поўначы. Захаванасць касцей добрая. Рукі складзены на жываце, правая на левай. У пахаванні выяўлены нацельны крыжык і медальён, а таксама касцяны гузік (гл. малюнак 5, №№ 26, 27, 22 паводле Вопіса індывідуальных знаходак; малюнак 6, *а–в*). Каля касцяка знойдзена 12 каваных цвікоў ад труны. Паводле антрапалагічнай экспертызы, праведзенай В.А. Емяльянчык[5], парэшткі належалі мужчыне ва ўзросце ад 50 гадоў.

*Пахаванне 2* знаходзілася на адлегласці 0,4 м на поўнач ад пахавання 1 на глыбіні 1,18 м ад узроўню дзённай паверхні (гл. малюнак 5). Захаванасць касцей добрая. Арыенціроўка касцяка заходняя, з адхіленнем на поўнач. Палажэнне рук нетыповае: рукі выцягнуты, толькі крыху сагнуты ў лакцях, кісці знаходзіліся на тазавых касцях. У пахаванні выяўлены 3 гузікі і фрагмент тканіны (гл. малюнак 5, №№ 24, 25, 23 паводле Вопіса індывідуальных знаходак; малюнак 6, *г–е*). Каля касцяка знойдзена 9 каваных цвікоў ад труны. Паводле антрапалагічнай экспертызы, парэшткі належалі мужчыне ва ўзросце 20–30 гадоў з паталогіяй пазваночніка.

*Пахаванне 3.* Пры зачыстцы паўднёвай сценкі квадрата А1 быў выяўлены чэрап пахавання 3 (гл. малюнак 5), якое выходзіла за межы шурфа, і 3 каваныя цвікі ад труны. Чэрап знойдзены на глыбіні 1,46 м ад узроўню дзённай паверхні. Улічваючы познюю храналогію артэфактаў з пахаванняў 1–2, касцяк пахавання 3 не разбіраўся і не парушаўся.

[5] Аўтар выказвае падзяку дацэнту кафедры гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай, кандыдату біялагічных навук, дацэнту В.А. Емяльянчык за праведзеную антрапалагічную экспертызу.




**пахаванне 1: *а* – гузік, *б* – нацельны крыжык, *в* – медальён;**
**пахаванне 2: *г* і *д* – гузікі, *е* – гузік, прышыты да кавалка тканіны**

**Малюнак 6. – Могільнік каля в. Васькавічы Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Шурф 2015 г.**
**Пахавальны інвентар**

Увесь палеаантрапалагічны матэрыял быў перададзены палеаантраполагу В.А. Емяльянчык для першаснай апрацоўкі і далейшага вывучэння. Прынятая ў Полацкім дзяржаўным універсітэце практыка пастаяннага захоўвання ўсіх астэалагічных парэштках, выяўленых у час археалагічных даследаванняў, дазволіла праз некалькі гадоў правесці іх паглыбленае вывучэнне. Рэнтгенаграфія і камп’ютарная тамаграфія пазваночніка індывіда з пахавання 2 выявіла паступовае развіццё паталогіі, у выніку якой адбылося пашкоджанне пазванкоў (з 9-га па 13-ы грудных і 1-га паяснічнага), міжпазванковых дыскаў і зрашчэнне пашкоджаных пазванкоў паміж сабой. Прычынай дэфармацыі, якая фарміравалася на працягу некалькіх месяцаў або гадоў, верагодна, з’яўляецца сухотны спандылёз. Мужчына амаль не мог хадзіць, але паступовае развіццё хваробы дазволіла пражыць яму не адзін год. У канцы жыцця ён, верагодна, у асноўным ляжаў на баку, паколькі дэфармацыя пазваночніка дасягнула такой ступені, што галава мусіла знаходзіцца на ўзроўні таза [3, с. 136, 145–146]. Падкрэслім, што ў выпадку перапахавання выяўленых пры раскопках парэштках правесці іх падобнае паглыбленае вывучэнне было б немагчыма. Відавочна, спецыфічнае палажэнне рук касцяка пахавання 2 тлумачыцца пазначанай паталогіяй. Пры моцнай дэфармацыі пазваночніка на момант раскопак і з улікам тафанамічных змен палажэння касцей складзеныя на тазавых касцях рукі былі толькі крыху сагнуты ў лакцях.

**Індывідуальныя знаходкі** прадстаўлены інвентаром пахаванняў 1–2 (гл. малюнак 6) і каванымі цвікамі ад трун пахаванняў 1–3.

*Інвентар пахавання 1* прадстаўлены:

1) касцяным гузікам дыяметрам 2,7 см з чатырма несіметрычнымі адтулінамі, што ўказвае на яго саматужны выраб (гл. малюнак 6, *а*);

2) нацельным крыжыкам з металу жоўтага колеру, пакрытым карозіяй зялёнага колеру, што ўказвае на медны сплаў (гл. малюнак 6, *б*). З аднаго боку крыжыка знаходзіцца выява распяцця, з іншага – лацінскі надпіс «MISSION», выявы цвіка, абцугоў і перакрыжаваных дзіды і тросці з губкай. Адзначым цікавую іканаграфію выявы. У каталіцкай традыцыі ногі Хрыста прынята адлюстроўваць прыбітымі да крыжа адным цвіком, у праваслаўнай – двумя цвікамі. На крыжыку з пахавання 1 лацінскі надпіс указвае на каталіцкую, а выява Хрыста – на праваслаўную традыцыі. Не выключана, што такое спалучэнне сведчыць аб тым, што крыжык быў выраблены для ўніяцкай царквы;

3) авальным медальёнам з металу белага колеру з трыманнем для ланцужка і адным звёнам ланцужка (гл. малюнак 6, *в*). На рабры медальёна маецца залатніковая проба «84», якая ўжывалася ў царскай Расіі, РСФСР і СССР да 1927 г. і ўказвае на сярэбраны сплаў.

*Інвентар пахавання 2* прадстаўлены:

1) двума металічнымі (?) гузікамі дыяметрам 2,6 см, пакрытымі тканінай (гл. малюнак 6, *г*, *д*);

2) адным металічным гузікам дыяметрам 1,5 см, прышытым да фрагмента тканіны (гл. малюнак 6, *е*).

Цвікі, выяўленыя ў магільных ямах пахаванняў 1–3, указваюць на наяўнасць трун і на тое, што яны былі зроблены з дошак.

**Масавыя знаходкі** прадстаўлены фрагментам металічнай патэльні, выяўленай пад каменным крыжам, і фрагментамі керамічнага начыння (19 пазіцый), знойдзенымі ў квадратах А1 і Б1 на поўнач ад каменнага крыжа (пласт 1). Цеста аднароднае, абпал добры, з унутранага боку начынне пакрыта палівай светла-карычневага колеру, са знешняга – добра загладжана. Фрагменты начыння могуць быць датаваны XIX – пачаткам XX ст. Размяшчэнне фрагментаў посуду ў пласце 1 над пахаваннямі дазваляе інтэрпрэтаваць іх як памінальны інвентар.

Зыходзячы з тых асаблівасцей пахавальнага абрада, якія можна зафіксаваць па матэрыяльных рэштках, даследаваныя на могільніку Васькавічы пахаванні дэманструюць пераемнасць традыцый папярэдняй эпохі, якія выразна прасочваюцца на суседніх могільніках Івесь і Доўгае. Гэта праяўляецца ў практыцы стварэння каменных надмагілляў і пастаноўкі каменных крыжоў, наяўнасці над магіламі фрагментаў керамікі (рэшткаў памінальнага інвентара), агульных заканамернасцях палажэння цела памерлых (заходняя арыенціроўка касцяка з магчымымі адхіленнямі, рукі пераважна складзены на жываце, грудзях або тазавых касцях), наяўнасць труны, прысутнасць інвентара, які не супярэчыць хрысціянскаму канону [4, с. 325–337]. Устойлівасць пахавальных традыцый адзначалася даследчыкамі і для іншых мікрарэгіёнаў Беларускага Падзвіння [5, с. 261–269]. У той жа час, на развіццё пахавальнай практыкі можа ўказваць узрастанне колькасці рэчаў пахавальнага інветара.

**Заключэнне.** Такім чынам, у ходзе археалагічнага абследавання могільніка каля былой в. Васькавічы Глыбоцкага раёна ў 2015 г. былў складзены сітуацыйны план, зафіксаваны параметры двух каменных крыжоў, зроблены фотаздымкі апошніх. На могільніку быў закладзены шурф плошчай 10 м$^2$, у межах якога знаходзіўся крыж 1. У межах шурфа было выяўлена 3 і даследавана 2 пахаванні (пахаванне 3, выяўленае ў сценцы шурфа, не разбіралася і не даследавалася).

Пахаванне 1 і 2 – мужчынскія. Пахаванне 1 было пазначана каменнай канструкцыяй у выглядзе вымасткі над верхняй паловай шкілета з вялікім камянём у галавах пахавання. З прычыны блізкага размяшчэння пахаванняў 1 і 3 дакладнае размежаванне камянёў у квадраце А1 паміж надмагільнымі канструкцыямі пахаванняў 1 і 3 праблематычна.

Нетыповае палажэнне рук у пахаванні 2 тлумачыцца не адметнасцямі пахавальнага абраду, а хваробай (паталогіяй пазваночніка). Пахаванні былі ажыццёўлены ў змацаваных кованымі цвікамі трунах і мелі інвентар, прадстаўлены гузікамі, нацельным крыжыкам і медальёнам. Блізкае размяшчэнне касцякоў, адсутнасць парушэння анатамічнага парадку касцей і аднолькава добры стан іх захаванасці ўказвае на тое, што пахаванні былі зроблены ў кароткі прамежак часу (магчыма, адначасова). Пахавальны і памінальны інвентар дазваляе датаваць пахаванні канцом XIX ст., магчыма, пачаткам XX ст. Нацельны крыжык з надпісам на лацінскай мове ўказвае на магчымую прыналежнасць памерлых да каталіцкай канфесіі. Аднак прысутная на ім выява ўкрыжаванага Хрыста, характэрная для праваслаўнай іканаграфіі, можа сведчыць аб прыналежнасці да ўніяцкага веравызнання.

Пахаванні 1–2 утрымліваюць значную колькасць прадметаў пахавальнага інвентару (гузікі ад вопраткі, медальён, крыжык). У параўнанні з практычна безынвентарнымі пахаваннямі XIV – XVIII стст. гэта адлюстроўвае развіццё пахавальных традыцый. У той жа час арыенціроўка касцякоў, палажэнне рук, пахаванне ў трунах са змацаваных кованымі цвікамі дошак, наяўнасць каменнага крыжа і памінальнага інвентара (фрагментаў керамікі) сведчыць аб пераемнасці з традыцыйнай для рэгіёна пахавальна-памінальнай практыкай перыяду позняга Сярэднявечча – ранняга Новага часу.

ЛІТАРАТУРА

1. Археалогія Беларусі. У 4 т. Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / В.М. Ляўко і інш.; пад рэд. В.М. Ляўко. – Мінск: Беларуская навука, 2011. – 597 с.
2. Штыхов Г.В. Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и эпохи феодализма. Вып. 2. – Минск : Полымя, 1971. – 276 с.
3. Васильев С.В., Булгин Д.В., Симавонян К.В., Боруцкая С.Б., Емельянчик О.А., Оганесян А.О., Карташов С.И., Чичаев И.А. Опыт исследования палеопатологии позвоночника с помощью компьютерной томографии и рентгенографии // Вестник археологии, антропологии и этнографии. – 2022. – № 3(58). – С. 136–147. DOI: https://doi.org/10.20874/2071-0437-2022-58-3-12.
4. Чараўко В.У. Пахавальны абрад познесярэдневяковага могільніка каля в. Івесь Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці (па матэрыялах археалагічных даследаванняў 2010–2015 гг.) // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы VII Міжнар. навук. канф., Полацк, 1–2 лістапада 2017 г. / уклад. Т.У. Явіч. – Полацк: Полацкае кніжнае выдавецтва, 2019. – С. 325–337.
5. Дук Д.У. Археалагічныя раскопкі на грунтовым могільніку Туржэц 2 Полацкага раёна // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. – Мінск, 2008. – № 15. Археалогія эпохі Сярэднявечча. Да 80-годдзя з дня нараджэння Г. В. Штыхава. – С. 261–269.

*Паступіў 29.12.2022*

# АРХЕОЛОГИЧЕСКИЕ ИССЛЕДОВАНИЯ НА МОГИЛЬНИКЕ ВОЗЛЕ ДЕРЕВНИ ВАСЬКОВИЧИ ГЛУБОКСКОГО РАЙОНА

***В.В. ЧЕРЕВКО***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*Статья посвящена описанию археологических исследований на грунтовом кладбище возле бывшей деревни Васьковичи Глубокского района. На могильнике имелась каменная конструкция в виде обкладки и два каменных креста. Было исследовано два мужских погребения. Костяки ориентированы головой на запад с отклонениями к северу. В заполнении могильных ям находились остатки гробов из досок, скрепленных гвоздями. Погребальный инвентарь присутствовал в обоих погребениях и представлен пуговицами, нательным крестиком и медальоном. Поминальный инвентарь представлен фрагментами керамической посуды. Инвентарь позволяет датировать погребения XIX – началом XX в.*

***Ключевые слова:*** *погребения, могильник, Белорусское Подвинье, Васьковичи, каменные надгробия, каменные кресты.*

# ARCHAEOLOGICAL INVESTIGATIONS AT THE BURIAL GROUND NEAR THE VILLAGE OF VASKOVICHI, GLUBOKOE REGION

***V. CHARAUKO***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The paper is devoted to the description of archaeological research at the soil cemetery near the former village of Vaskovichi, Glubokoe region. The burial ground had a stone structure in the form of a lining and two stone crosses. Two male burials were examined. The skeletons are oriented with their heads to the west with deviations to the north. In the filling of the grave pits were the remains of coffins made of boards fastened with nails. The grave goods were present in both burials and were represented by buttons, a pectoral cross and a medallion. The funeral inventory is represented by fragments of ceramic dishes. The inventory allows dating the burials of the $19^{th}$ – early $20^{th}$ centuries.*

***Keywords:*** *burials, cemeteries, Vaskovichi, Belarusian Dvina Region, stone gravestones, stone crosses.*